# МЫ ВАС ЧАКАЕМ



Фота Ю. БОНДАРАВА.

Той ясны вераснёўскі дзень урэзаўся ў маю памяць назаўсёды. Нават восеньскае сонца свяціла ярчэй і, здаецца, падзяляла маю радасць і мае хваляванні: у мяне першы працоўны дзень! Учарашняя студэнтка, я ўпершыню ішла на работу. Я — бібліятэкар! Ішла і баялася. Баялася, што не спраўлюся з работай, не ведала, як мяне прымуць у калектыве. Чым бліжэй падыходзіла да бібліятэкі, тым болей сцішвала крок. А каля дзвярэй спынілася зусім. Пастаяўшы некалькі хвілін, нарэшце, пераступіла парог...

Пра ўсё гэта зараз успамінаю з усмешкай. Хваляванні былі дарэмнымі. Зараз хочацца расказаць аб людзях, з якімі я працую, аб нашым беларускім аддзеле Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.

Мінск, вуліца Кірава, 49. Трэці паверх. Тут мы працуем. Створаны 50 год таму назад, амаль з самага пачатку станаўлення беларускай культуры і асветы, аддзел беларускай літаратуры шырока адчыняе дзверы перад усімі, хто хоча ведаць шматвяковую гісторыю і культуру нашага народа.

Перад уваходам у беларускі аддзел вас сустракае задуменная постаць бронзавага Францыска Скарыны. Ён, славуты сын беларускага народа, як заўважыў паэт,

«...марыў калісьці:  
«Ціснучы» кнігі на мове бацькоў,  
Простаму люду ў роднай краіне  
Зробіць даступнай ён мову вякоў.  
Толькі радзіму сваю ў ліхалеццi  
Мара яго абляцець не змагла:  
Білася роспачна птушкай у клетцы,  
Вочы ж бядноты сляпіла імгла.  
Думалі, згіне, як статак, нямое  
Племя, пакорнае ў вечным ярме.  
Колькі іх — мужных, што матчынай мове  
Шлях пракладалі і змерлі ў турме...»

Сінявокая Беларусь! Сёння мы ганарымся тваёй славутай гісторыяй, ганарымся тым, што зроблена працоўнымі рукамі беларускага народа, яго розумам і сэрцам. Мы ганарымся, што збіраем увесь гэты скарб, сканцэнтраваны ў вялікім цудзе чалавечага розуму — кнігах. Кнігі... Гэта сапраўды багацце

нашага аддзела. Іх дзвесце тысяч! Старонка за старонкай расказваюць яны аб цудоўнай беларускай прыродзе, яе мнагаводных рэках, блакітных азёрах, лясных пушчах, аб слаўнай гісторыі народа, яго культуры, мастацтве, аб сучаснай Беларусі.

Унікальная калекцыя кніг пра Беларусь — гэта сама гісторыя народа. Вось царства старых кніг. Цьмяна паблісквающь маліавыя тамы «Живописной России», адліваюць золатам вокладкі кніг пра князёў Радзівілаў, Зборнікі старажытных актаў, Літоўскія статуты, першае падарожжа па Беларусі выдатнага вучонага Васіля Севергіна.

Старонкі пажоўклі ад часу. Колькі павандравалі гэтыя старыя кнігі па свеце, па розных прыватных бібліятэках, пакуль атрымалі пастаянную прапіску на гэтых паліцах.

І зноў кнігі... Першыя выданні Коласа, Купалы, Багушэвіча, Багдановіча, Цёткі...

А якія прыгожыя сучасныя кнігі! Нездарма апошняе выданне паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» атрымала прэмію на Лейпцыгскім кірмашы як самая лепшая кніга свету.

Шматлікія каталогі і картатэкі сціпла маўчаць, разумеючы, што без іх немагчыма раскрыць багацце унікальнага фонда. Яны як адкрытая кніга аб роднай Беларусі. Пагартайце яе, і вы даведаецеся аб новабудоўлях і дасягненнях рэспублікі ў розных галінах вытворчасці, даведаецеся, што пішуць пра Беларусь народы нашай многанацыянальнай краіны і за яе мяжой. Пазнаеце радасць творчасці пры пошуках адказаў на тыя ці іншыя пытанні, звязаныя з гісторыяй, эканомікай, этнаграфіяй, мовай, літаратурай рэспублікі.

Цішыня ў навуковых залах аддзела. Тут калісьці схіляліся над кнігай тыя, хто будаваў сацыялістычную культуру Беларусі: народныя паэты Янка Купала, Якуб Колас, вядомыя вучоныя, работнікі літаратуры, культуры і мастацтва. Цяпер у аддзеле чытаюць выдатныя дзеячы навукі і культуры сённяшняй Беларусі, тыя, хто ўзбагачае яе дасягненні і праслаўляе сваю рэспубліку на міжнароднай арэне. Прыязджаюць да нас чытачы з Чэхаславакіі, Польшчы, Францыі, нават Амерыкі.

Аддзел вядзе вялікую даследчую работу. Складае рэтраспектыўныя бібліяграфічныя даведнікі па гісторыі, прыродзе, літаратуразнаўстве, мастацкай літаратуры. Нашы бібліяграфічныя даведнікі пасылаюць за мяжу.

Мы атрымліваем пісьмы са шматлікімі запытаннямі з розных куткоў СССР і з замежных краін. Беларуссю цікавяцца, Беларусь вывучаюць!

Паток чытачоў. Яны ідуць, каб атрымаць кнігу. Ідуць параіцца, атрымаць даведку. Яны ідуць і будуць ісці, бо заўсёды іх ветліва сустракаюць супрацоўнікі аддзела, якія дадуць неабходную параду і кансультацыю.

Семнаццаць гадоў працуе тут загадчыца нашага аддзела Рыма Міхайлаўна Чыгірова. Акрамя асноўнай работы, у Рымы Міхайлаўны шмат іншых абавязкаў. Яна вядзе камсамольскі



На выдачы кніг бібліятэкар Алена Іванаўна Касінская.



Побач з чытачкай Галіна Бараздзіна.

семінар вышэйшага звяна, член таварыства «Веды». Летась у лістападзе ў бібліятэцы праводзілася рэспубліканская канферэнцыя па краязнаўчай рабоце, прысвечаная 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Ініцыятарам яе была наша Рыма Міхайлаўна. А колькі сіл і энергіі яна аддае маладым!

У нашым аддзеле працуюць 19 чалавек. Мы — як адна сям'я. Хочацца хоць некалькі слоў сказаць пра кожнага. Ніна Барысаўна Ватацы — галоўны бібліёграф, адна з пачынальнікаў беларускай нацыянальнай бібліяграфіі, заслужаны дзеяч культуры БССР. Працуе ў бібліятэцы з 1930 года. Цяжка ацаніць тое, што зроблена ёю за гэтыя гады: бібліяграфічныя ўказальнікі на творы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, П. Пестрака і іншых, указальнік па беларускай драматургіі і мастацкай літаратуры. Яе пяру належыць кніга пра М. Багдановіча «Шлях паэта». І зараз яна працягвае пошукі новых матэрыялаў аб яго творчасці.

Валянціна Усцінаўна Баханькова. Працуе ў аддзеле з 1964 года. Яна — заснавальнік новага для аддзела інфармацыйнага бюлетэня «БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны». Людміла Міхайлаўна Бабкова — наш прафорг, цудоўны чалавек, чулы, паважаны.

Тамара Радзевіч, Валянціна Жак, Марыя Ганчарова, Раіса Сіпакова, Тамара Непарожняя, Ларыса Навіцкая, Надзея Доўнар — цудоўныя людзі. Нельга ў кароткай заметцы расказаць пра ўсіх, трэба самім з імі пазнаёміцца. Прыходзьце да нас, у наш аддзел беларускай літаратуры і бібліяграфіі. Дзяжурныя супрацоўнікі раскажуць пра аддзел, адкажуць на вашы пытанні. Да вашых паслуг дзве чытальныя залы. Тут вы можаце прачытаць свежыя газеты і часопісы, пазнаёміцца на выстаўцы з навінкамі літаратуры.

«Мой родны кут, як ты мне мілы...»

Хай будзе мілым ён для ўсіх. Прыходзьце да нас!

**Галіна БАРАЗДЗІНА,**
**старшы бібліятэкар**